Галоўнае ўпраўленне па адукацыі
Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта
Аддзел па адукацыі Асіповіцкага выканаўчага камітэта
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №3 г. Асіповічы”

# Малая Радзіма - жыцця падтрымка

**Аўтар:**
**Саманчук Алена Аляксандраўна,**
9 «А» клас,
тэл. +375336367099

**Кіраўнік:**
**Жаўрыд Клаўдзія Канстанцінаўна,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
тэл. +375293684459

Асіповічы, 2018

Ёсць такая краіна, якую немагчыма знайсці на геаграфічнай карце. Але яна існуе, жыве ў сэрцы кожнга з нас. Назву мае не адну “родны кут”, “малая радзіма”, “бацькаўшчына”.

Што такое малая радзіма? Месца, дзе ты нарадзіўся? Месца, дзе ты зрабіў першыя крокі? Дом, дзе ты жывеш?

Для кожнага гэта паняцце значыць нешта сваё. Для аднаго чалавека- гэта месца, дзе ён нарадзіўся, горад, дзе ён пражыў сваё дзяцінства. Для другога - гэта краіна, у якой ён жыве. Для трэцяга - яго дом, вуліца.




Для мяне малая радзіма - гэта месца, адкуль ідуць мае карані,населены пункт, дзе праводзілі сваё дзяцінства мая бабуля, маці, а зараз і я з сястрычкай. Месца, якое аб’ядноўвае нас усіх. Гэта невялічкая вёска ў Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці.

Дакладна не вядома, калі з’явілася вёска. Знойдзеныя археолагамі гарадзішчы і курганы сведчаць аб засяленні гэтых мясцін з даўніх часоў, дзесьці з 17 ст. Па пісьмовых крыніцах вядома як сяло ў Васілевіцкай валасці Рэчыцкага павета Мінскай губерніі. Паводле перапісу 1879 г. дзейнічалі капліца, царкоўнапрыходская школа, ветраны млын, кузня, карчма.

Мяне зацікавіла паходжанне назвы вёскі. Мясціна, дзе яна знаходзіцца, у далёкія часы ўяўляла сабой востраў, які акружалі балоты і лясы. На паўночна-ўсходнім баку вострава выбівалася некалькі крыніц. Адсюль і назва.



Існуе яшчэ версія: быццам, Ганна Катаржына Сангушка, маці Міхаіла Казіміра Рыбонькі гуляла па сваіх уладаннях. Праязджаючы па мясцовасці, дзе зараз знаходзіццца вёска, карэта пані загразла побач з крынічкамі. Краявіды ўразілі жанчыну, і яна загадала пабудаваць у гэтым месцы вёску. І зразумела, што назва яе Крынкі.

Вёска знаходзілася на казённай зямлі, і яе жыхары былі дзяржаўнымі сялянамі. За карыстанне зямлёй яны плацілі ў казну грашавы налог. Разам з тым сяляне абавязаны былі выконваць работу па рамонце дарогі, перавозіць на сваіх фурманках дзяржаўны груз, карміць салдат і коней, калі вайсковыя часці спыняліся ў Крынках.

Цікавяць і прозвішчы, якія носяць жыхары Крынак. Прозвішча маёй бабулі Блізнец. Такое прозвішча давалі перасяленцам з недалёкіх мясцін. Гэта прозвішча носіць большая колькасць жыхароў вёскі. Яшчэ адно прозвішча, распаўсюджанае ў вёсцы, - гэта Коцур. Па мясцовай легендзе, у гэтыя краі з Украіны прыйшлі два паны Коцур (у вёску Крынкі) і Астапенка і тут засталіся. Прозвішча паходзіць з іудзейскага слова “кацор”, што значыць кароткі, верагодна, продак быў нізкага росту.

У гады Савецкай улады вёска развівалася як большасць вёсак Беларусі: быў арганізаваны калгас, адкрылася школа. Вёска ўзбуйнілася ў вынніку перасялення бліжэйшых хутароў. Да вайны яна лічвала 1050 чалавек.

Вайна! Яна не мінула і маю вёску. Фашысты палілі яе двойчы. Першы раз у жніўні 1942г. У агні згарэла 52 чалавекі. Другі - у снежні: у выніку карных аперацый загінула каля 300 мірных жыхароў. З вайны ў вёску не вярнулася 806 чалавек.



А вёска… Яна адрадзіласяі зажыла мірным жыццём, ушаноўваючы памяць загінуўшых.

У Крынках існуе звычай. На дом вешалі чырвоныя зоркі. Кожная зорка азначала загінуўшага ці не вярнуўшагася з вайны. На хаце маёй прабабулі - чатыры зорачкі .

Жыццё на старажытнай зямлі, якую нашы продкі ад'ваявылі ў балот і фашыстаў, працягваецца.

Вёска Крынкі - мая малая радзіма, якая яднае мяне і маіх продкаў, мая ў жыцці падтрымка.